Радыё Свабода

Жывы блог. Суды за Дзень Волі па ўсёй Беларусі

27 сакавік 2017, 08:30

Пасьля масавых затрыманьняў на акцыях 25 сакавіка і 26 сакавіка ў Беларусі чакаюць судоў у панядзелак да сотні чалавек, паводле зьвестак Беларускага Хэльсынскага камітэту. Прыблізна столькі ж — паводле сьпісу «Вясны». Агулам за два дні затрымана было каля тысячы чалавек. Да Дня Волі суды над «недармаедамі» ішлі два тыдні.

Самае новае напача...

Журналістку Марыну Кастылянчанку за ўдзел у акцыі 15 сакавіка і за непадпарадкаваньне міліцыі **Савецкі суд Менску пакараў** арыштам на 15 сутак.

Менск. Прысуд **Паўлу Белавусу** — 15 сутак. Павал спытаў судзьдзю: «Вам не сорамна?». Той не адказаў і ўцёк з залі пад воклічы: «Ганьба!». Павал папрасіў сяброў ахоўваць і дапамагаць жонцы, перадаваць яму кніжкі.

Бабруйск. Максіма Буйніцкага, якога пасьля адбыцьця 15 сутак у ноч на 26-га сакавіка зноў затрымалі, судзьдзя Гормаш аштрафаваў за хуліганства на 2 базавыя. Паводле сьведак-міліцыянтаў, Максім выйшаў з хаты ў начную краму, стаў сярод двара й пачаў махаць рукамі й крычаць.

Гомель. Судзьдзя Цэнтральнага раённага суду Гомля Аляксандар Піскуноў пакараў 19-гадовага **Віктара Чумачэнку** арыштам на 5 сутак.

Бабруйск. Затрыманага 24 сакавіка **Ўладзімера Лазарава** судзілі за ўдзел у мітынгу 12 сакавіка — штраф 5 базавых (100 р).

Суд Чыгуначнага раёну Гомеля пакараў **Ксеню Кавалёву** штрафам у 10 базавых (230 рублёў). Да суду яна правяла двое сутак у ізалятары.

Аляксандра Яўсейчука з Гомеля пакаралі двума суткамі арышту, якія ён ужо адседзеў. Цяпер яму выклікалі хуткую, у яго цукровы дыябэт. Судзьдзя Сяргей Кармановіч.

Бабруйск. Затрыманага ўчора **Аляксея Даніленку** судзілі за ўдзел у мітынгу 12 сакавіка на падставе знойдзенага ў тэлефоне фатаздымку. Прысудзілі штраф 100 рублёў. Суд абдыўся не ў ізалятары, як меркавалася раней, а ў гарадзкім судзе.

Аднавіўся працэс над Паўлам Белавусам. Пасьля паказаньняў сьведак-журналістаў сьведка-міліцыянт Яфанаў, які раней казаў, што затрымліваў Белавуса, цяпер прызнаў, што не затрымліваў сам, а толькі перадаў калегам, каб затрымалі. Сказаў, што забыўся пра гэта і таму адразу не сказаў. Зьмяніў паказаньні і другі сьведка-міліцыянт. «Так, не затрымліваў, перадаў па рацыі. Але Белавус мацюгаўся».

Павал папрасіў судзьдзю, каб той прымусіў сьведак назваць матныя словы, якімі нібыта лаяўся. Але судзьдзя адмовіў: «Не дазволю, каб у маім судзе мацюкаліся». Тады Павал папрасіў, каб яны напісалі гэтыя словы на паперы, але суд і ў гэтым адмовіў.

Сьведка Сяргей Мірончык, намесьнік камандзіра атраду міліцыі спэцпрызначэньня, сказаў, што Белавус каля ўнівэрсаму «Цэнтральны» зрабіў правапарушэньне і ён яго затрымаў. На пытаньне судзьдзі, чаму ў справе няма ягоных тлумачэньняў, сказаў, што кіраваў падразьдзяленьнем. Прызнаў, што ў момант затрыманьня Белавус ня лаяўся. Сьведкі-міліцыянты блытаюцца ў паказаньнях.

Прысуды ў Віцебску

Віцебск. Журналіст **Арцём Сізінцаў** з Воршы — 10 сутак за ўдзел у несанкцыянаванай акцыі.

Праваабаронца **Леанід Сьвецік** за акцыі 25-га і 26-га — 15 сутак.

Суд над журналістам **Канстанцінам Мардзьвінцавым** судзьдзя **Іна Грабоўская** праводзіць у закрытым рэжыме — у сваім кабінэце. За дзьвярыма каля 10 чалавек, у кабінэце — 2, чатыры крэслы вольныя. Перайсьці ў вялікую залю судзьдзя адмовілася.

***

Віцебскі праваабаронца **Павал Левінаў** мінулай ноччу быў пераведзены з ізалятару часовага ўтрыманьня ў шпіталь У яго падвышаны ціск. Пасьля затрыманьня 26 сакавіка яму стала кепска, у Кастрычніцкі РАУС выклікалі хуткую дапамогу, але шпіталізаваць Левінава мэдыкі адмовіліся. Пасьля адпраўкі ў ІЧУ яму стала горш. Праваабаронцу ўсе-такі паклалі ў шпіталь.

Актывіст БХД **Дзяніс Садоўскі** аштрафаваны судом Цэнтральнага раёну на 80 базавых велічынь (1840 рублёў ці 978 даляраў).

Полацак. Прайшлі суды ў Полацку. Праваабаронцу **Юрыя Бельскага** прызналі вінаватым у хуліганстве — нібыта ён лаяўся матам раніцай 25 сакавіка, калі яго выклікалі на гутарку ў Сьледчы камітэт.

Затрыманаму пасьля пратрусу на полацкім офісе Свабоднага прафсаюзу Беларускага прафсаюзнаму актывісту **Віктару Стукаву** прысуджаны штраф памерам 20 базавых велічынь. Таксама за хуліганства: нібыта лаяўся матам падчас пратрусу.

Міліцыянты пагражалі «згнаіць у турме» пэнсіянэра, якога ня могуць асудзіць, бо ён не называе прозьвішча

Спадара Валера затрымалі на акцыі 25 сакавіка, але праз адсутнасьць прозьвішча і дакумэнтаў ня могуць распачаць над ім суд. Мужчыну каля 60 год, у яго могуць быць пашкоджаныя рэбры.

Вінярскаму — 8 сутак

Менск. **Максіма Вінярскага** пакаралі 8 суткамі арышту. Яго судзілі ў Партызанскім судзе. «Ўсяго толькі?» — зьдзівіўся Вінярскі. Пасьля прысуду ён сказаў судзьдзі Валчковай: «Усё роўна я лічу вас вінаватай у рэпрэсіях, калі-небудзь вы адкажаце за гэта».

Судзяць хворага на дыябэт

Гомель. У суд Цэнтральнага раёну прывезьлі **Багуслава Гвозьдзева, Віктара Чумачэнку**, а таксама 41-гадовага актывіста прафсаюзу РЭП **Аляксандра Еўсейчука**, які хварэе на цукровы дыябэт.

Еўсейчук паведаміў, што належнай мэдычнай дапамогі ў ізалятары не аказвалі. Узровень цукру ў крыві 13,8 м/м. Сказалі, калі будзе звыш 20, тады будуць ратаваць.

Менск. Ленінскі раённы суд. **Аляксандру Хаўкіну** судзьдзя **А. Карнейчык** дала штраф 25 базавых велічынь. Ён пасьля суду заявіў, што будзе абскарджваць пастанову суду.

Апэратару «Белсату» Баразенку — 15 сутак

У Маскоўскім судзе Менску апэратара тэлеканалу «Белсат» **Аляксандра Баразенку** асудзілі за «дробнае хуліганства» на Дзень Волі на 15 сутак арышту — ён нібыта «крычаў і лаяўся, абураўся дэкрэтам №3 і не рэагаваў на папярэджаньні».

Баразенку судзіла судзьдзя **Тацяна Мотыль**, супраць яго сьведчылі амапаўцы **Арцём Міхалевіч** і **Варывончык** (імя назваў неразборліва). Баразенка просіць Міхалевіча назваць брыдкія словы, якія ён нібыта казаў. Міхалевіч адмовіўся, але пагадзіўся напісаць. Паказаньні на карысць Баразенкі давалі прадстаўнік «Белсату» Аляксей Мінчонак і журналістка Кацярына Андрэева.

«Белсат» вёў жывую трансьляцыю:

На Дзень Волі затрымлівалі і іншых журналістаў, якія супрацоўнічалі з Белсатам: **Віктара Масаловіча** і **Андрэя Шобіна** ў Менску, **Ларысу Шчыракову** ў Гомлі. Апошнюю выклікаюць у суд 28 сакавіка.

Менск. Ленінскі раённы суд. **Павал Белавус** распавеў: «Учора зусім не кармілі, толькі сёньня раніцай далі кашу — сечку з разынкамі». Жартуе: «Ужо, відаць, накалупалі».

Суд над Паўлам Белавусам, гукавы-анлайн:

Менск. Ленінскі раённы суд. Музыка **Аляксандар Хаўкін** распавёў, што яго моцна зьбівалі, у тым ліку пінкамі заганялі ў аўтазак. Ударылі па сківіцы гэтак, што два дні мог есьці толькі адным бокам. Яшчэ Хаўкін наракае, што не давалі пазваніць жонцы і сваякам.

Менск. Ленінскі раённы суд. **Мікіта Краснакуцкі** з «Моладзі БНФ» пакараны на 10 сутак арышту.
